ДА ЮБІЛЕЮ КЛАСІКА




# ГУЧЫЦЬ БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА Ў ЗАВОССІ

**ЗАВОССЕ. 23 верасня 2023 года ў Музеі-сядзібе Адама Міцкевіча ў фальварку Завоссе (Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобласць) прайшоў традыцыйны літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі», які сёлета быў прысвечаны 225-й гадавіне з дня нараджэння класіка польскай і беларускай літаратуры. У фэсце прыняла ўдзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Таццяна ЯЦУК (Навагрудскі раён). Таццяна Мікалаеўна не толькі годна выступіла сама, але і прывезла на фестываль літаратурнае аб'яднанне «Купальскія зоры» (г. Баранавічы), якім яна кіруе.**

Завоссе – месца, вядомае не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Тут нарадзіўся славуты паэт Адам Міцкевіч (1798-1855). Як паведамляе сайт Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, сядзіба Міцкевічаў была адноўлена ў 1998 годзе. Сёння тут месціцца музейны комплекс. У залах музея-сядзібы разгорнута літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Вяртанне пана Тадэвуша». Яна распавядае пра гісторыю фальварка ў Завоссі, дэманструе адноўленыя інтэр'еры старой сядзібы і малюе вобразы яго жыхароў.

Заканамерна, што тут у рамках дыялогу эпох і культур на традыцыйным фестывалі гучыць беларускае мастацкае слова. Мерапрыемства ладзіцца Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Баранавіцкім раённым выканаўчым камітэтам пры ўдзеле грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі». У праграме фэста выступілі паэты Таццяна Яцук, Юрась Мазалевіч, Міхаіл Стрыжоў, Наталля Несцярук, празаік Таццяна Смаляк; госця з Нясвіжа, паэтэса, празаік Зоя Кулік і іншыя; прагучалі аўтарскія песні ў выкананні спявачкі Рэгіны Скіпар. Свае вырабы прадставілі народныя ўмельцы. Чароўны дух мастацтва пацвердзіў прысутнасць у гэтых мясцінах неўміручай душы вялікага паэта-рамантыка.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі» і яго ўдзельнікі. Брэсцкая вобласць, Баранавіцкі раён. 23 верасня 2023 года.






Таццяна Яцук (Навагрудскі раён),
член Саюза пісьменнікаў Беларусі,
паэтэса, кіраўнік літаратурнага аб'яднання
«Купальскія зоры» (Баранавічы)



**Юрась Мазалевіч**



**Міхаіл Стрыжоў**



**Наталля Несцярук**



**Таццяна Смаляк**



**Зоя Кулік**

